ДУК «Ваўкавыская раённая бібліятэка»
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу



# «Ён ведаў як зрабіць «Вясёлку»»

*(да 110-годдзя з дня нараджэння Васіля Віткі (Цімох Васільевіч Крысько))*

Літаратурная спадчына Васіля Віткі трывала і надзейна заняла сваё пачэснае і ганаровае месца ў залатым фондзе беларускай нацыянальнай літаратуры і культуры XX стагоддзя. Васіль Вітка – пісьменнік шматграннага таленту, выявіў сябе як паэт, празаік, драматург, перакладчык, публіцыст. Але найбольш вядомы і прызнаны ён як дзіцячы пісьменнік. Тут самароднасць яго таленту, мастацкая індывідуальнасць раскрыліся з найбольшай паўнатой, шчодрасцю і самааддачай. Плённая праца Васіля Віткі, багатыя набыткі яго творчасці высока ацэнены. Васіль Вітка заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1970).

Ён – лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы (1972), узнагароджаны Міжнародным ганаровым дыпломам імя Ханса Крысціяна Андэрсена з занясеннем прозвішча пісьменніка ў Ганаровы спіс вялікага дацкага казачніка (1978).





Нарадзіўся Васіль Вітка (сапраўднае імя – Крысько Цімох Васільевіч, іншыя псеўданімы Цімох Зрэбны, В. Цімскі) 16 мая 1911 года ў вёсцы Еўлічы Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў беднай сялянскай сям'і. Праз колькі месяцаў пасля нараджэння сына бацька Васіль Максімавіч з сям'ёю падаўся ў Сібір у пошуках заробку.

"У 1912 г., калі мне споўніўся год ад роду, – чытаем у аўтабіяграфіі Васіля Віткі, – мы былі ўжо ў Омску. Тулячыся ў падсуседзях па чужых кутках, бацька карміў сям'ю тым, што, гнучы спіну на гарадскім рынку, падбіваў і латаў просты і грубы абутак людзей…". Хутка Васіля Максімавіча ўзялі ў армію, і сям'і стала яшчэ цяжэй. Падумвалі, каб вярнуцца на радзіму, ды змаглі ажыццявіць мару толькі пасля рэвалюцыі.

**На чоўне сабраўся ў бязмежную даль,**
**У шлях невядомы, бясконцы.**
**Хай бераг далёка, а я паміж хваль**
**На сонца вяслую, на сонца!**



Бацька
Васіль Максімавіч
(1889-1943)



Маці
Марыя Міхайлаўна
(1884-1965)

Васіль Максімавіч любіў чытаць. Па вечарах, а часам усю ноч ён чытаў пры газоўцы ўслых. Слухаць гэта чытанне прыходзілі аднавяскоўцы. Слухаў і сын, хоць бацька думаў, што той спіць. У час гэтых чытанняў маленькі Цімка займаў сваё пастаяннае месца – "стуліўшыся на палку пад старым кажухом". Маці ж Марыя Міхайлаўна, выдатная працаўніца, мела мяккі голас, любіла паспяваць. Хоць не заўсёды выпадала ёй на гэта вольная часіна. Душэўнасць, мелодыя яе песень уліліся пазней ў гучанне паэзіі Васіля Віткі, у музыку яго твораў для дзяцей. Бацькі сталі тымі людзьмі, якія з маленства прывілі сыну любоў да працы, творчасці, навучылі яго быць сумленным.

Таму ўжо ў другім класе Цімка Крысько склаў свой першы верш. Але рэчаіснасць была такая суровая, што пакідала мала месца для паэзіі. Па-ранейшаму жылося бедна, таму з падказкі Валадыма і, не жадаючы быць дома нахлебнікам, пасля сямігодкі падаўся падлетак у Слуцкую прафтэхшколу, якую скончыў у 1928 годзе.

На працу маладога слесара накіравалі на Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат, які лічыўся адной з першых у тыя гады новабудоўляў у Беларусі. Змены, што адбываліся наўкола, захапілі юнака. Душа спявала. Хацелася пра ўсё расказаць у вершах. Паэтычныя памкненні маладога слесара заўважылі, а неўзабаве запрасілі на працу ў заводскую шматтыражку.

Яшчэ праз некалькі месяцаў з'вярнуў на Цімоха Крысько ўвагу і тагачасны рэдактар бабруйскай акруговай газеты "Камуніст" Міхась Лынькоў. Менавіта Міхась Лынькоў з'явіўся першым настаўнікам і крытыкам будучага паэта Васіля Віткі. Дзякуючы Міхасю Лынькову ў літаратурным дадатку "Вясна" да газеты "Камуніст" у 1928 годзе з'явіўся першы верш семнаццацігадовага паэта Цімоха Крысько "На чоўне сабраўся ў бязмежную даль":

**На чоўне сабраўся ў бязмежную даль,**
**У шлях невядомы, бясконцы.**
**Хай бераг далёка, а я паміж хваль**
**На сонца вяслую, на сонца!**

У 1930 годзе Міхась Лынькоў узяў юнака ў штат рэдакцыі. Потым Цімох Крысько супрацоўнічаў у рэдакцыі жлобінскай чыгуначнай газеты "Ударнік" (1933-1935), рэспубліканскіх газетах "Чырвоная змена" (1935-1937), "Літаратура і мастацтва" (1937-1938), часопісе "Полымя рэвалюцыі" (1938-1939).


ПОЛЫМЯ
РЭВОЛЮЦЫІ
3
1940
Юліан Пшыркоў
«НОВАЯ ЗЯМЛЯ» ЯКУБА КОЛАСА


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
Газета выдаецца з красавіка 1921 года
ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА ЛКСМ БЕЛАРУСІ
1983 г.
СЕРАДА
7
ВЕРАСНЯ
У ЭФЕКТЫЎНАЙ, ТВОРЧАЙ РАБОЦЕ, НЯСТОМНЫМ ПОШУКУ РЭЗЕРВАЎ— ЗАЛОГ БУДУЧЫХ ДАСЯГНЕННЯЎ
З рэспубліканскага сходу партыйнага, савецкага, прафсаюзнага і камсамольскага актыву сумесна з прадстаўнікамі працоўных калектываў
Выступленне таварыша
І. І. БОДЗЮЛА
Заява Савецкага ўрада

З дня ўтварэння часопіса «Беларусь» (студзень 1944) працаваў яго адказным сакратаром, з 1948 — намеснікам, з 1951 — галоўным рэдактарам газеты «Літаратура і мастацтва». У 1957-74 — галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка». У 1974-87 — член сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі кінастудыі «Беларусьфільм».


ЛіМ
ГАЗЕТА ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ
ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА
ЧЫТАЙЦЕ
СПАДЗЯЁМСЯ І ВЕРЫМ...
ЛІТВА — БЕЛАРУСЬ



Пісьменніцкая біяграфія Цімоха Крысько, яго сталая літаратурная творчасць пачалася ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Яго палымянае слова гучала ў партызанскіх лясах і беларускіх вёсках. У гады вайны ён узяў сабе псеўданім Васіль Вітка. Выдаваць кнігу ён не спяшаўся – набіраўся жыццёвага вопыту, паэтычнага майстэрства. І толькі ў пачатку 1944 года ў Маскве выйшаў першы зборнік вершаў паэта Васіля Віткі – "Гартаванне", у якім, як пісаў Кузьма Чорны, Радзіма паўстае перад намі поўнай гармоніяй глыбокіх вобразаў. Яго вершы сведчылі, што ў літаратуру прыйшоў не выпадковы чалавек, а таленавіты майстар паэтычнага слова:








**Ёсць на зямлі такі куток,**
**З якім навек я злучаны,**
**Адкуль ступіў свой першы крок –**
**Мая Радзіма – Случчына…**

Паэт заўсёды быў удзячны сваёй радзіме, той маленькай вёсачцы Еўлічы, у якой нарадзіўся. Адсюль і асноўныя матывы яго паэзіі, своеасаблівы этап яго творчасці. Васіль Вітка ў сваіх вершах адлюстроўвае непаўторную і таямнічую прыгажосць роднай Случчыны, роднай Беларусі, паказвае сувязь з загадкава-мудрай, сатканай з дабрыні і пяшчоты душой народа. Пазней яго мірная зямная і сонечная паэзія ўвойдзе ў зборнікі паэзіі "Поўдзень" (1946), "Вернасць" (1953), "Ружа і штык" (1958), "Паверка" (1961), "Выбраная лірыка" (1968), "Праводзіны лета" (1972), "Вышыня святла" (1977), "Случчына" (1981), "Трэція пеўні" (1987), "Свята дружбы" (1987) і інш. А ўсяго ім напісана дванаццаць "дарослых" кніг, у якіх паэзія вызначаецца грамадзянскім пафасам. Асноўныя яе матывы – услаўленне подзвігу чалавека ў Вялікую Айчынную вайну, хараство роднай зямлі, роздум аб жыцці, прызначэнні паэзіі.


Васіль Вітка
Вышыні святла


Васіль Вітка
Трывога ў Ельнічах


Васіль Вітка
ТРЭЦЯ ПЕЎНІ

Аднак асаблівай пяшчотай, асаблівым, непаўторным бляскам заззяў паэтычны талент Васіля Віткі ў творах для дзяцей. Ён прыйшоў у дзіцячую літаратуру, як сам прызнаваўся "па закліку сумлення, па закліку душы, па закліку сапраўднай любові". Творчасць Васіля Віткі для дзяцей пачалася з казачнага эпасу ў 1947 годзе. Першую вершаваную казку "Вавёрчына гора" паэт склаў, а потым напісаў, каб падбадзёрыць свайго хворага сына.

Выйшла казка асобнай кніжкай у 1948 годзе.

Вялікай творчай удачай стала наступная казка Васіля Віткі – "Буслінае лета" (1957), з галоўным персанажам трэцякласнікам Васем. Шчаслівы лёс напаткаў казку Васіля Віткі – "Казка пра цара Зубра" (1959).

Затым амаль адна за адной выходзяць казкі "ППШ" (1962), "Дударык" (1962), "Казкі дзеда Васіля" (1969), "Казка без канца" (1969), "Хто памагае сонцу" (1975), "Казкі і краскі" (1978) і іншыя.


ВАСІЛЬ ВІТКА
Чытанка–
маляванка


Василь
Витка
Белочкино горе


ВАСІЛЬ ВІТКА
ДОМ,
ДЗЕ ЖЫВУЦЬ
СЛОВЫ

Дзіцячая паэзія Васіля Віткі багатая рознымі жанрамі, сярод іх ёсць "складанкі-чытанкі, байкі-самаграйкі, песні-калыханкі, жарты-перакруткі, гулі-самагудкі, лічылкі, загадкі, ладачкі-ладкі". Напісаны яны з тонкім адчуваннем асаблівасцей дзіцячага ўспрымання, з любоўю да загадкава-чароўнай краіны Дзяцінства. Дзеці палюбілі кнігі Васіля Віткі, такія, як – зборнік апавяданняў "Зайчык-вадалаз" (1962), кнігу вершаў "Дударык" (1964), "Азбука Васі Вясёлкіна" (1965), выдатную кнігу вершаў, загадак, лічылак, пацешак і казачак для малодшага ўзросту "Чытанка-маляванка" (1971). Добра вядомыя беларускім дзецям кнігі – "Беларуская калыханка" (1971), "Хто памагае сонцу" (1975), "Казкі" (1976), "Ладачкі-ладкі" (1977), "Мы будуем метро" (1979), "Казкі і краскі", "Госці", "Загадка пра зярнятка" (усе выйшлі ў 1984 годзе), "Дзецям" (выбраныя творы ў 2-х кнігах, 1986), "Свята дружбы" (1987), "Выхаванне словам" (2001 ), "Урокі роднага слова" (2008) і інш.

Яшчэ адным своеасаблівым этапам ў творчасці Васіля Віткі стала з'яўленне ў канцы пяцідзесятых гадоў яго таленавітых апавяданняў. Першыя апавяданні з'явіліся ў 1960 годзе на старонках часопіса "Полымя". Зноў звярнуўся да жанру прозы, у сямідзесятых гадах, апублікаваўшы цыкл "Паміж людзей добрых". Гэта ўдумлівы, шчыры расказ пісьменніка пра час, у якім ён жыў, і пра людзей, з якімі яму пашанцавала быць блізкім. Асабліва ўдаліся партрэты Кузьмы Чорнага, Міхася Лынькова, Івана Мележа, Максіма Танка, Янкі Брыля, Янкі Маўра, Уладзіміра Дубоўкі, Міколы Лобана, выдатнага ўкраінскага педагога і пісьменніка Васіля Сухамлінскага і іншых.

Аднак уяўленне пра Васіля Вітку будзе няпоўным, калі не ўлічваць яго цікавыя спробы ў галіне драматургіі. Вядома яго п'еса "Прамень будучыні" (1947) – пра калгаснае пасляваеннае жыццё. Заўсёды будзе актуальнай п'еса "Шчасце паэта" (1950) – пра беларускага народнага песняра Янку Купалу, якая атрымала сцэнічнае ўвасаблене ў тэатры імя Купалы ў 1952 годзе.



Васіль Вітка вядомы і як перакладчык. Шмат зроблена ім у галіне мастацкага перакладу з іншых моў на беларускую. Ён перакладаў на беларускую мову прозу і паэзію. Яму належаць пераклады з рускай мовы (М. Салтыкова-Шчадрына, А. Талстога, А. Чэхава, У. Маякоўскага, Ф. Цютчава, С. Маршака, С. Міхалкова, А. Барто, М. Рубцова), украінскай (М. Рыльскага, В. Бычко, М. Стэльмаха, П. Воранько, М. Прыгары), літоўскай (М. Вайнілайціса, В. Бараўскаса), латышскай (Я. Райніса, В. Лукса, Я. Асланіса, В. Грэнскаўса), балгарскай (А. Босева, Л. Станчава), англійскай (Уолтэра Мэя) і інш.




Апошняй кнігай Васіля Віткі стаў зборнік "Дом, дзе жывуць словы" (1995), своеасаблівы вершаваны слоўнік. "Слоўнік народнай мовы для дзяцей", – як вызначыў жанр аўтар. А што ёсць дзіцячая мова, Васіль Вітка не сумняваўся. Разам з тым ён і шкадаваў, што гэтай мовай, на жаль, мала цікавяцца дарослыя.

Памёр Васіль Вітка 5 ліпеня 1996 года. Але кажуць, што ў сапраўдных пісьменнікаў даты смерці няма. Творы Васіля Віткі і сёння ў актыве нацыянальнай літаратуры. Яны сталі сапраўднай класікай. Яны патрэбны хлопчыкам і дзяўчынкам пачатку XXI стагоддзя таксама, як былі патрэбны іх бацькам. Захапляцца імі будзе яшчэ не адно пакаленне. Так будзе. Бо, як адзначыў народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч, Васіль Вітка пазбягаў тэм аднадзёнак. Як правіла, ён пісаў пра тое, "што глыбока запала ў душу і прарасло думкай". Разумнае, таленавітае ніколі і нідзе бясследна не знікае. Напісанае ім заўсёды будзе жыць, уплываць на бясконцы літаратурны працэс.

Беларусь шануе памяць мудрага, таленавітага пісьменніка, педагога, цікавага чалавека. На словы Васіля Віткі многія кампазітары (А. Бараноўская, Г. Вагнер, Я. Касалапаў, І. Лучанок, С. Палонскі, Я. Цікоцкі і інш.) напісалі песні.

Рэдакцыя часопіса "Вясёлка", першым рэдактарам якога быў Васіль Вітка, заснавала прэмію імя Васіля Віткі. Аўтары лепшых твораў адзначаюцца прэміяй імя Васіля Віткі і спецыяльным медалём".

